✓**24 сакавіка** ў галерэі «Панарама» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пачала працу выстава акварэлі Марыі Сыраквaш **«Вандроўкі ў мінулае»**. Яна знаёміць з любімымі аб'ектамі акварэльнага жывапісу мастачкі – архітэктурнымі помнікамі, якія і сёння можна ўбачыць пад час падарожжа па Беларусі. Выстава – вынік шматлікіх вандровак «нон-стоп» па Беларусі і ў гістарычную мінуўшчыну роднай зямлі, наведвання знакавых мясцін і малавядомых куткоў. *«У маёй падсвядомасці адбіліся выявы старых сядзіб і палацаў, капліц і храмаў, старых паркавых дрэў і пакрытых імхамі камянёў»*, – кажа Марыя. У многіх мясцінах мастачка бывала па некалькі разоў і на ўласныя вочы бачыла, як бязлітасны час літаральна на вачах заканчвае тое, што не паспелі зрабіць людзі. Так нарадзілася ідэя адлюстраваць у серыі акварэльных малюнкаў бясконцы карагод вобразаў Беларусі, што знікае, паказаць іх чароўную прыгажосць і скамянелую гісторыю. Серыя складаецца з некалькіх дзясяткаў прац, створаных у 2019 – 2021 гг. У

экспазіцыі – Крэўскі і Смалянскі замкі, царква і касцёл у Ракаве, сядзібы Рэйтанаў, Дамейкаў, Храптовічаў, касцёл у Івянцы, капліца ў Залессі, кляштар картузіянцаў, краявіды навокал Гальшанскага замка, Навагрудскага фарнага касцёла і інш. Рамантычныя і шчырыя акварэльныя вобразы мастачкі даюць магчымасць зазірнуць праз чароўнае вакно ў свет слаўнага мінулага нашай краіны, усвядоміць, што яно калісьці было сённяшнім днём, што зробленае ўчора дасць плён заўтра.

Выстава будзе працаваць да 29 мая.